# ТВОРЧА, ДРУЖНА І З ЭНТУЗІЯЗМАМ

***Не толькі весела адпачыць, але і добра зарабіць – такое рашэнне сёлета прынялі 37 студэнтаў нашага ўніверсітэта, актывісты ГА «БРСМ». Машэраўцы працавалі ва Усерасійскім дзіцячым цэнтры «Арляня», на РУП «Талачынскі кансервавы завод» і ЗАТ «Атлант». Сваімі ўражаннямі і эмоцыямі яны падзяліліся з рэдакцыяй.***

**Андрэй АСТАХАЎ, лепшы камандзір міжнароднага вытворчага працоўнага праекта «Атлант-2021», выпускнік юрыдычнага факультэта гэтага года:**



– На працягу двух летніх месяцаў наш вытворчы атрад «Сталь» з 7 чалавек працаваў у Мінску на заводзе «Атлант».

Машэраўцы ўпершыню прымалі ўдзел у такім масштабным праекце. Нягледзячы на гэта, мы змаглі на высокім узроўні прадэманстраваць вытворчым паказчыкі і творчы патэнцыял. На заводзе нашы студэнты займаліся зборкай дзвярэй халадзільнікаў і маразільнікаў.

Самае цяжкае было тое, што ў нас было толькі 3 – 4 гадзіны на адпачынак і сон. Кожную раніцу мы прачыналіся прыкладна ў 4.30, каб да 6.40 даехаць да завода. А пасля працы і да гадзіны ночы рыхтаваліся да розных конкурсаў у рамках міжнароднага праекта.

Напрыклад, аднойчы за адну ноч нам трэба было напісаць дзве песні. Было складана, але мы імкнуліся быць у ліку лепшых.

Таксама няпроста было згуртаваць наш невялікі калектыў, але я быў упэўнены, што лепшы матыватар – гэта асабісты прыклад. Таму нават тыя студэнты, якія ехалі на завод проста зарабіць грошы, гледзячы на мяне і астатніх байцоў, падцягваліся і таксама прымалі ўдзел у агульнай справе. А я імкнуўся раўняцца на лепшых, глядзеў, як працуюць вопытныя камандзіры іншых атрадаў, бо, безумоўна, ад мяне шмат у чым залежаў наш камандны вынік.

Такім чынам, кожны з нас змог не толькі папрацаваць і зарабіць, але і ў поўнай меры акунуцца ў студэнцкае атраднае жыццё.



**Кацярына ФОФАНАВА, студэнтка 2 курса факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій:**

– Я працавала ў дзіцячым лагеры «Алімпійская вёска» на базе Усерасійскага дзіцячага цэнтра «Арляня» у складзе Беларускага педагагічнага атрада «Фенікс». І гэта было лепшае лета ў маім жыцці.

Мне ўдалося папрацаваць з дзецьмі, набыць новых сяброў, абмяняцца вопытам з удзельнікамі іншых педагагічных атрадаў Расіі.

Спачатку было складана знайсці агульную мову з выхаванцамі. Трэба было зацікавіць дзяцей якой-небудзь дзейнасцю, разабрацца ў іх праблемах і даць параду, зрабіць з атрада сапраўдную каманду. Але побач са мной знаходзіліся людзі, гатовыя дапамагчы і падказаць, таму ў мяне ўсё атрымалася. У будучыні я планую і далей займацца педагагічнай дзейнасцю.



**Ангеліна НІЧЫПАРЭНКА, студэнтка 2 курса юрыдычнага факультэта:**

– Сёлета ў Талочыне ў складзе сельскагаспадарчага атрада я займалася зборам чырвоных парэчак. Надвор'е было спякотнае, таму час нашай працы карэктаваўся. Для нас былі створаны добрыя ўмовы: на працу і назад нас вазілі на аўтобусе, у нумарах гасцініцы было ўсё неабходнае, а трохразавае харчаванне было смачным.

Трэба адзначыць, што для ўдзельнікаў праекта былі арганізаваны розныя спартыўна-масавыя і творчыя конкурсы, мерапрыемствы. Мы спаборнічалі з іншымі студэнцкімі атрадамі, якія прыехалі з розных гарадоў рэспублікі. Таму змаглі не толькі падзарабіць, але і праявіць сябе, паказаць свае таленты. Цікава, што літаральна за месяц наш атрад стаў адзінай камандай, сапраўднай сям'ёй. Аплата працы залежала толькі ад самога чалавека, яго здольнасцяў і жадання.

Мяне ўсё цалкам задаволіла.

По словах Анастасіі Барынавай, першага сакратара ПА ГА «БРСМ» ВДУ імя П.М. Машэрава, для нашых студэнтаў праца ў студатрадах – гэта цудоўная магчымасць зарабіць уласныя грошы, пашырыць кругагляд, а таксама пазнаёміцца з новымі людзьмі.

**Вікторыя ЧАКУШКА. Фота з архіву рэспандэнтаў.**


**УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ИМЕНИ П.М. МАШЕРОВА» ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС НА ЗАМЕЩЕНИЕ ДОЛЖНОСТЕЙ:**

**заведующих кафедрами:** германской филологии – 1,0; экологии и географии – 1,0;

**профессора кафедры:** общего и русского языкознания – 0,25;

**доцентов кафедр:** германской филологии – 1,0; музыки – 1,0; декоративно-прикладного искусства и технической графики – 1,0; экологии и географии – 1,0; психологии – 1,0; алгебры и методики преподавания математики – 1,0;

**старших преподавателей:** германской филологии – 1,0; уголовного права и уголовного процесса – 1,0; теории и методики физической культуры и спортивной медицины – 1,0; коррекционной работы – 1,0; психологии – 1,0; физического воспитания и спорта – 1,0.

**Срок подачи заявлений** – один месяц со дня опубликования объявления.

**Наш адрес:** г. Витебск, пр-т Московский, д.33, отдел кадров.

**Телефон:** 8 0212 37-58-56.